Дзяржава і права

Сяргей ЕЛІЗАРАЎ

# МАГІЛЁЎ — сталіца БССР: нерэалізаваны праект



*ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч — загадчык кафедры гісторыі і паліталогіі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. Аўтар больш за 130 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку манаграфіі "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009). Распрацоўвае праблемы гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР.*

У канцы 1930-х гг. была зроблена спроба перанесці сталіцу Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі з Мінска ў Магілёў. Рашэнне аб гэтым было прынята 2 снежня 1937 г. на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б. Праз некалькі дзён пасля гэтага дакладная запіска з абгрунтаваннем неабходнасці пераносу беларускай сталіцы была накіравана ў ЦК ВКП(б) і СНК СССР на імя І.Сталіна і В.Молатава для зацвярджэння[1].

У якасці галоўных аргументаў супраць захавання за Мінскам статуса сталіцы рэспублікі вылучаліся, па-першае, стратэгічныя меркаванні: горад знаходзіўся на адлегласці 30 км ад савецка-польскай граніцы, што ў абставінах чакання вайны стварала трывожнае адчуванне. Па-другое, меліся на ўвазе і меркаванні палітыка-эканамічныя: Мінск размяшчаўся на захадзе БССР, што ва ўмовах замацавання ў СССР жорсткай камандна-адміністрацыйнай сістэмы і цэнтралізаванага кіравання, неразвітасці сродкаў сувязі і шляхоў зносін стварала складанасці ў кіраўніцтве сельскімі раёнамі рэспублікі, якія знаходзіліся на значнай адлегласці ад сталіцы. Сам Мінск характарызаваўся ў запісцы як горад бесперспектыўны: "отсутствие достаточной энергетической базы, не имея достаточно воды и т.п. не дадут возможности в дальнейшем развивать город Минск как индустриальный и культурный центр республики" (прычына, як паказала недалёкая будучыня, у большай ступені надуманая)[2].

На карысць Магілёва як верагоднай сталіцы працавалі некалькі фактараў. Па-першае, спрыяльнае геаграфічнае становішча горада фактычна ў цэнтры рэспублікі, наяўнасць добрых шляхоў зносін з Масквой, Ленінградам, Кіевам, Данбасам, Мінскам па чыгунцы і шашах Магілёў—Мінск, Магілёў—Бабруйск, Магілёў—Кіеў і г.д. Па-другое, гэта прыродныя ўмовы, якія дазвалялі стварыць буйную паліўна-энергетычную базу — вялікія запасы торфу і энергетычныя магчымасці ракі Днепр. Па-трэцяе, наяўнасць у горадзе "дастатковай індустрыяльнай базы". Усё гэта, як падкрэслівалася ў дакладной запісцы, стварала падставы, каб "Могилёв — как столицу БССР — быстро превратить в образцовый город — хозяйственный, политический и культурный центр республики"[3].

Усе пералічаныя довады рэальна адлюстроўвалі наяўныя ў той час перавагі Магілёва як будучага рэспубліканскага цэнтра ў параўнанні з іншымі буйнымі гарадамі рэспублікі. За гады дзвюх пяцігодак (1928—1937 гг.) значна павялічыўся прамысловы патэнцыял горада. Калі ў 1928 г. на магілёўскіх прадпрыемствах было занята 1 317 чалавек, а валавы аб'ём прадукцыі прамысловасці складаў 5 472 тыс. руб., то да 1937 г. былі пабудаваны буйныя прадпрыемствы (фабрыка штучнага валакна, аўтарамонтны, трубаліцейны, машынабудаўнічы заводы і г.д.), на якіх працавалі 13 674 чалавекі, а валавы аб'ём пра-

дукцыі павялічыўся ў 34 разы і склаў 184 115 тыс. руб. Насельніцтва горада за 1928—1937 гг. павялічылася на 31 тыс. чалавек і склала на 1 студзеня 1938 г. больш за 85 тыс. чалавек.

Аднак хуткі рост насельніцтва, звязаны перш за ўсё з міграцыйнымі працэсамі ў выніку прыцягнення новых працоўных рук на прамысловыя новабудоўлі, значна апярэджваў тэмпы развіцця гарадской інфраструктуры. Гэта было непазбежным вынікам палітыкі фарсіраванай індустрыялізацыі, калі на першы план выходзіла будаўніцтва фабрык і заводаў, а жылыя дамы, бальніцы, школы, установы культуры ўзводзіліся па меры магчымасцей. У дакладной запісцы ў ЦК ВКП(б) і СНК СССР кіраўніцтва БССР наступным чынам апісвала становішча гарадской інфраструктуры: "г. Могилёв ... за 20 лет износился, жилищно-коммунальное и культурно-бытовое обслуживание населения стоит на очень низком уровне".

Будаўніцтва жылля ў горадзе значна адставала ад павелічэння колькасці насельніцтва: калі ў 1930 г. на аднаго жыхара горада прыходзілася ў сярэднім 5,67 кв. м жылплошчы, то ў 1937 г. — менш за 4,5 кв. м. Тэхнічны знос жылога фонду складаў у сярэднім 40%, а для 60% будынкаў — да 50—60%, больш за 200 сем'яў гараджан жылі ў будынках, якім пагражаў абвал. У горадзе амаль адсутнічалі сродкі гарадскога транспарту, каналізацыя. Востра стаяла праблема водазабеспячэння — спажыванне вады складала толькі 16,7 літраў у суткі на чалавека пры мінімальнай норме не менш за 100 літраў. 21 пачатковая і сярэдняя школы на 7 855 месцаў праводзілі навучанне ў дзве-тры змены. Працавалі толькі 31 дзіцячы садок, разлічаны на 1 975 дашкольнікаў, пры ўлічанай патрэбе ў 6 625 месцаў. Па ступені насычанасці ВНУ і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі г. Магілёў займаў апошняе месца ў параўнанні з буйнымі індустрыяльнымі цэнтрамі БССР — Мінскам, Віцебскам, Гомелем[4].

Вышэйшыя рэспубліканскія органы ўлады тлумачылі такое становішча дастаткова прадказальна, у духу моднай у тыя гады тэмы барацьбы з "ворагамі народу" і "шкоднікамі", на якіх ускладалася ўся адказнасць за невыкананне планаў. У згаданай дакладной запісцы падкрэслівалася: "Враги народа — троцкисты, бухаринцы, национал-фашисты из бывшего руководства республики сознательно тормозили развитие г. Могилёва, во всех ассигнованиях на хозяйственное, культурное и городское хозяйство они г. Могилёв приравнивали к сельскохозяйственному району"[5]. Адзначалася, што "г. Могилёв в результате вредительской, диверсионной работы врагов народа — банды национал-фашистов, пробравшихся в руководящие партийные, советские органы Белорусской ССР, был отодвинут на второстепенное место и задержан в его дальнейшем развитии. Врагами народа созданы ряд узких мест и диспропорций во всех отраслях хозяйства, особенно в области благоустройства и социалистической реконструкции городского хозяйства Могилёва с целью вызова недовольства населения Партией и Советской властью"[6].

Для рэканструкцыі гарадской гаспадаркі Магілёва як будучага цэнтра рэспублікі кіраўніцтва БССР прасіла Маскву выдаткаваць на 1938 і 1939 гг. 350 млн руб., у першую чаргу на будаўніцтва ўрадавых будынкаў, школ, бальніц, стварэнне водаправода, каналізацыі. Пры ўмове выдзялення гэтых сродкаў прадугледжвалася завяршыць усе неабходныя для пераезду рэспубліканскіх органаў улады работы ў першым квартале 1939 г. і тады ж ажыццявіць перанос сталіцы з Мінска ў Магілёў. Але адзінства поглядаў адносна тэрміну магчымага пераезду ў беларускім кіраўніцтве не было. Падчас абмеркавання гэтага пытання на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б асноўны прамоўца — старшыня СНК БССР А.Ф.Кавалёў выказаўся, што найбольш рэальна завяршыць неабходныя для пераносу сталіцы мерапрыемствы ў 1940 г. У той жа час выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б А.А.Волкаў гаварыў аб магчымасці пераезду ўрадавых устаноў нават у канцы 1938 г. ці ў маі 1939 г.[7].

21 снежня 1937 г. прапанова беларускага кіраўніцтва аб пераносе сталіцы БССР у Магілёў была падтрымана Палітбюро ЦК ВКП(б), аднак запрошаная сума ў 350 млн руб. была прызнана "явно несуразной и рваческой"[8]. У выніку пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) "О городском строительстве в Могилёве в связи с переводом столицы Белорусской ССР" ад 19 красавіка 1938 г. на адміністрацыйнае і жыллёва-камунальнае будаўніцтва Магілёва ў 1938 г. было выдаткавана ўсяго 20,93 млн руб., у той час як кіраўніцтва БССР прасіла на 1938 г. больш за 205 млн руб.[9].

Прынцыповыя ўказанні па рэканструкцыі Магілёва як будучай сталіцы былі вызначаны ў пастанове СНК БССР "О генеральном плане реконструкции г. Могилёва" ад 17 сакавіка 1938 г.[10]. У гэтым дакуменце Беларускаму дзяржаўнаму праектнаму інстытуту (Белдзяржпраекту) было загадана да мая 1938 г. скласці генеральную схему планіроўкі Магілёва на 10-гадовы тэрмін. Пераўтварэнне Магілёва ў рэспубліканскі цэнтр патрабавала стварэння ўмоў для пераносу з Мінска шматлікіх рэспубліканскіх устаноў. Колькасць супрацоўнікаў цэнтральнага апарата вызначалася ў памеры прыкладна 10 тыс. чалавек, "размещение которых потребует большого объёма нового строительства".

У сферы эканомікі Магілёва вызначаліся наступныя арыенціры: 1) далейшае развіццё прамысловасці горада на падставе існаваўшых і стварэння новых відаў вытворчасці, галоўным чынам прадпрыемстваў хімічнай, металаапрацоўчай, харчовай прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў; 2) стварэнне неабходнай энергетычнай базы шляхам далейшага пашырэння БелДРЭС (будаўніцтва 3-й чаргі на 25 тыс. квт), будаўніцтва новай ЦЭЦ на 43 тыс. квт і ЦЭЦ фабрыкі штучнага залакна; 3) развіццё шляхоў зносін (рэканструкцыя чыгуначнага вузла, будаўніцтва двух мастоў цераз Днепр). Агульная колькасць занятых у



*Магілёўскі Дом Саветаў. Фота 2008 г.*

прамысловасці, на транспарце і будоўлях на 1947 г. вызначалася ў праекце ў 45 тыс. чалавек.

У галіне адукацыі, навукі, аховы здароўя прадугледжвалася імклівае развіццё сеткі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў: перавод з Мінска Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Інстытута фізкультуры, з Віцебска — медыцынскага інстытута, стварэнне Інстытута і камбіната выяўленчых мастацтваў, кансерваторыі і рэспубліканскай музычнай школы; перанос у Магілёў Акадэміі навук БССР, будаўніцтва ў горадзе 3 кінатэатраў, 3 дамоў культуры і дзіцячага дома культуры, 5 клубаў, 2 тэатраў, зімовага цырка, 50 школ.

Улады планавалі пабудаваць гарадскую каналізацыю, значна пашырыць сістэму водазабеспячэння (давесці ўзровень спажывання вады ў сярэднім да 200—250 літраў у суткі на чалавека). Асноўным сродкам унутрыгарадскога пасажырскага транспарту павінны былі стаць тралейбусы. Першую тралейбусную лінію планавалася ўвесці ў эксплуатацыю ў канцы 1940 г.

У Пастанове СНК БССР арыенцірам для планавання развіцця Магілёва на 10 гадоў акрэслівалася колькасць насельніцтва горада прыкладна ў 235 тыс. чалавек на канец 1947 г. (у наступныя гады — у 350 тыс. чалавек) "с полным обслуживанием бытовых и культурных потребностей этого населения". У дакуменце вызначалася нават вышыня новых будынкаў: "к постройке в Могилёве допускаются жилые дома высотой в 4 этажа, а на широких магистралях и в пунктах города, требующих наиболее парадного оформления, — более высокие дома, до 6-ти этажей". Пастанова была ўхвалена Бюро ЦК КП(б)Б у сакавіку 1938 г. "в качестве основных установок к руководству при составлении генеральной схемы планировки г. Могилёва"[11].

Распрацоўка генеральнай схемы развіцця Магілёва была завершана ў пачатку 1939 г. Яе падпісалі дырэктар Белдзяржпраекта Г.Я.Вернштэйн, галоўны інжынер Белдзяржпраекта В.І.Казінец і сам аўтар — галоўны інжынер праекта Д.І.Яскевіч. Гэтая схема была разлічана на перыяд 10—15 гадоў і прадугледжвала рэалізацыю ўсіх асноўных заданняў, выкладзеных ва ўрадавай пастанове. Для размяшчэння партыйнага, адміністрацыйнага і гаспадарчага апаратаў рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў прадугледжвалася будаўніцтва Дома Саветаў (на 2 000 супрацоўнікаў), Дома НКУС (без пазначэння колькасці супрацоўнікаў), Дома партыйных арганізацый (на 400 чалавек), Дома крэдытных устаноў (на 800 чалавек), Дома дзяржаўнага гандлю і кааперацыі (на 900 чалавек), Дома абласных арганізацый (на 1 400 чалавек), дзяржаўнага архіва. Агульны аб'ём адміністрацыйных будынкаў вызначаўся ў 645 тыс. куб. м на плошчы ў 13,25 га[12].

У адносінах прамысловага развіцця былі дакладна вытрыманы палажэнні ўрадавай пастановы з упорам на развіццё вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, хімічнай, металаапрацоўчай, харчовай прамысловасці. Прадугледжвалася будаўніцтва цэлюлозна-папяровага камбіната, содавага, мылаварнага, ліналеумавага, гадзіннікавага і машынабудаўнічага заводаў; заводаў штучнага каўчуку, штучнай падэшвы, электраматораў, камунальнага абсталявання, рамонту апаратуры сувязі, хлебазаводаў; мэблевай, бісквітнай, цукерачнай фабрык; развіццё сеткі існаваўшых прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай і скуранай прамысловасці. За кошт гэтага планавалася да-

*Табліца*

**Асноўныя паказчыкі развіцця г. Магілёва ў 1932—1940 гг.**[20]

| | 1932 г. | 1937 г. | 1940 г. |
|---|---|---|---|
| Колькасць насельніцтва (тыс. чалавек) | 68,8 | 85 | 110 |
| Колькасць прамысловых прадпрыемстваў | 28 | 37 | 49 |
| Валавы аб'ём прамысловай прадукцыі (тыс. руб.) | 75,0 | 143,7 | 186,4 |
| Колькасць рабочых | 6 932 | 10 652 | 16 410 |
| Колькасць школ | 18 | 19 | 22 |
| Тавараабарот (тыс. руб.) | 23 202 | 111 691 | 173 688 |

даткова павялічыць аб'ём прамысловай вытворчасці горада на канец разліковага перыяду ў параўнанні з 1937 г. у 3,2 разы[13].

У галіне адукацыі, акрамя пазначанага ў пастанове СНК БССР, дадаткова планавалася перавесці з Мінска Інстытут журналістыкі, Вышэйшую сельскагаспадарчую камуністычную школу, арганізаваць Водны тэхнікум і тэхнікум сувязі[14].

Пры выкананні гэтых заданняў па рэканструкцыі горада і перамяшчэнні ўрадавых устаноў з Мінска ў Магілёў узніклі значныя складанасці. Тэмпы іх вырашэння кіраўніцтва БССР не задавальнялі. 28 красавіка 1939 г. была прынята спецыяльная пастанова ЦК КП(б)Б "О переводе столицы Белоруссии из г. Минска в г. Могилёв", у якой марудныя тэмпы рэканструкцыі Магілёва тлумачыліся фактарамі суб'ектыўнымі пры наяўнасці "всех условий для выполнения и перевыполнения плана". Быў абвінавачаны "ряд руководящих работников наркоматов БССР", якім ставілася ў віну "политическая недооценка хозяйственного и стратегического значения перевода столицы из Минска в Могилёв". У пастанове адзначалася: "Существующее настроение сводится к тому, чтобы не спешить со строительством и затянуть перевод столицы на несколько лет. Перевод столицы и в соответствии с этим строительство не рассчитывается на конкретный, установленный срок. Руководство могилёвским строительством сводится к принятию бесчисленных решений, выполнение которых не контролируется и большинство которых не выполняются...". Цалкам верагодна, што пераезд у Магілёў не задавальняў партыйна-савецкую наменклатуру, якая ўзнялася на вышэйшы ўзровень і наладзіла даволі камфортнае жыццё (у параўнанні з астатнімі савецкімі жыхарамі) у Мінску. Для яе пераезд у Магілёў, дзе бытавыя ўмовы жыцця былі значна горшыя, чым у Мінску, быў малапрывабным варыянтам.



Будынак кінатэатра "Радзіма".

Для выпраўлення становішча выкарыстоўваліся традыцыйныя для таго часу сродкі і метады. Па-першае, была створана ўрадавая камісія з шырокімі паўнамоцтвамі па пераносу сталіцы ў г. Магілёў на чале з намеснікам старшыні СНК БССР П.А.Захаравым у наступным складзе: наркам НКУС БССР Л.Ф.Цанава, сакратар ЦК КП(б)Б Н.Р.Грэкава, старшыня Дзяржплана БССР І.Л.Чорны. Па-другое, вызначаліся канкрэтныя тэрміны ўводу ў эксплуатацыю першачарговых аб'ектаў, неабходных для перамяшчэння рэспубліканскіх устаноў у Магілёў, і тэрміны пераезду асноўных устаноў у Магілёў на лістапад 1939 г.[15].

Аднак падчас рэалізацыі гэтай пастановы камісія адразу сутыкнулася з недахопам фінансавых і матэрыяльных сродкаў, а таксама працоўных рэсурсаў. Дадатковыя сродкі на паскарэнне гарадскога будаўніцтва было вырашана атрымаць за кошт пераразмеркавання сродкаў "на благоустройство городов, выделив за счёт Минска, Витебска, Гомеля и др. городов средства, необходимые для Могилёва". Для забеспячэння будоўляў рабочай сілай было прапанавана выкарыстаць традыцыйныя для савецкага часу "малазатратныя" варыянты — энтузіязм моладзі і працу зняволеных. Для гэтага Бюро ЦК ЛКСМБ прыняло рашэнне аб узяцці шэфства над рэканструкцыяй Магілёва і накіраванні туды 1 200 камсамольцаў. Адначасова ўрадавая камісія прыняла рашэнне "полностью освободить один посёлок для размещения посылаемых на работу в гор. Могилёв на строительство людей по линии НКВД"[16].

У сярэдзіне 1939 г. у Магілёў пачалі пераносіць некаторыя наркаматы і ўпраўленні (наркамат камунальнай гаспадаркі БССР, упраўленне прамысловасці будаўнічых матэрыялаў пры СНК БССР). У той жа час яшчэ шэраг наркаматаў (прамысловасці, аўтамабільнага транспарту) рыхтаваліся да пераезду[17].

Аднак пачатак 1 верасня 1939 г. Другой сусветнай вайны і далучэнне тэрыторы Заходняй Беларусі да БССР знялі асноўную прычыну пераносу сталіцы. Дзяржаўная мяжа была адсунута на захад, і такім

чынам Мінск апынуўся ў цэнтры рэспублікі. Пытанне аб пераносе сталіцы страціла сваю актуальнасць.

У ліпені 1940 г. супрацоўнікі магілёўскай абласной канторы Белдзяржпраекта адкарэкціравалі генеральную схему планіроўкі Магілёва. Тэрміны новага плана рэканструкцыі вызначаліся ў 15 гадоў, выключалася будаўніцтва большасці адміністрацыйных будынкаў, прамысловых прадпрыемстваў, аб'ектаў гарадской сацыяльнай інфраструктуры, а разліковая колькасць гарадскога насельніцтва на канец перыяду рэканструкцыі скарачалася да 169 тыс. чалавек[18].

Спроба пераўтварэння Магілёва ў сталіцу рэспублікі паспрыяла сацыяльна-эканамічнаму і культурна-адукацыйнаму развіццю горада *(гл. табліцу)*. За кароткі тэрмін у цэнтры яго былі ўзведзены Дом Саветаў (галоўны архітэктар І.Лангбард), Дом НКУС (архітэктар П.Абросімаў), гасцініца "Днепр" (архітэктар А.Воінаў), кінатэатр "Радзіма" (архітэктар З.Вараксін). На беразе Дняпра быў створаны Цэнтральны парк культуры і адпачынку. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе было вырашана пытанне водазабеспячэння, пайшлі першыя аўтобусы[19].

У пастанове СНК БССР ад 17 сакавіка 1938 г. асобна падкрэслівалася: "При определении размеров и планировки территории города Могилева исходить из сохранения основ исторически сложившегося города, но с коренной перепланировкой его путем решительного упорядочения сети городских улиц и площадей"[21]. Але распрацоўшчыкі генеральнай схемы менш за ўсё кіраваліся інтарэсамі захавання гістарычнага аблічча Магілёва, а арыентаваліся ў першую чаргу на другую частку гэтага патрабавання. Яны запланавалі разбурэнне гістарычнага архітэктурнага ансамбля былой Губернатарскай плошчы (ратушы, дамоў губернатара, губернскага праўлення, гарадской управы і архіва), архірэйскага палаца, храмаў (Богаяўленскага, Трох святціцеляў, Васкрасенскай і Мікалаеўскай цэркваў, касцёлаў св. Антонія, св. Станіслава і інш.), якія не ўпісваліся ў стэрэатып "узорнага сацыялістычнага горада — цэнтра БССР"[22]. Іх месцы павінны былі заняць "сталінскія новабудоўлі" і помнікі У.І.Леніну і Ф.Э.Дзяржынскаму. "Ахвярай" сацыялістычнай рэканструкцыі Магілёва стаў у тыя часы толькі Іосіфаўскі сабор, які ў 1938 г. быў разбураны, а на яго месцы пабудавана гасцініца "Днепр". Астатняе дакончыла Вялікая Айчынная вайна, пасля завяршэння якой многія з разбураных гістарычных і культавых будынкаў Магілёва ўжо не аднаўляліся.



*Будынак гасцініцы "Днепр".*

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НА РБ). Ф. 4п, воп. 1, спр. 11051, арк. 1—10, 46—48.

[2] Там жа. Арк. 47.

[3] Там жа.

[4] Там жа. Арк. 7, 48, 74.

[5] Там жа. Арк. 47.

[6] Там жа. Арк. 35.

[7] Там жа. Арк. 2—5, 48.

[8] Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 17, воп. 3, спр. 994, арк. 23.

[9] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 5446, воп. 21, спр. 4, арк. 33—37.

[10] НА РБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 11051, арк. 35—45.

[11] Там жа. Арк. 33.

[12] Там жа. Арк. 78.

[13] Там жа. Арк. 6, 20—21.

[14] Там жа. Арк. 74.

[15] Там жа. Спр. 13440, арк. 74.

[16] Там жа. Спр. 13611, арк. 188—189.

[17] Польскі С.А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917—1941 гг.). Мн., 1973. С. 125.

[18] НА РБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 11051, арк. 78—87.

[19] Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т. 5, кн. 1. Магілёўская вобласць. Мн., 2008. С. 64.

[20] НА РБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 18418, арк. 8—9.

[21] Там жа. Спр. 11051, арк. 38—39.

[22] Кандрацьева Л. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 3. С. 44—46.